**Зімовы лагер дэмакратыі ЕГУ**

**«Дэмакратыя і тэхналогіі: вывучэнне судачынення лічбавых інструментаў і еўрапейскіх каштоўнасцей»**

**(15-21 лютага 2024 г., Вільня, Літва)**

Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт рады паведаміць аб цудоўнай магчымасці для студэнтаў прыняць удзел у зімовым лагеры, прысвечаным лічбавай дэмакратыі і актыўнасці. Зараз мы набіраем да 30 слухачоў у лагер, які пройдзе з 15 па 21 лютага ў турыстычна-аздараўленчым комплексе пад Вільняй. Калі ласка, падавайце заяўку па наступнай спасылцы: https://forms.gle/VMhU1ipadWQDu7JA8

Калі вы жадаеце развіць крытычнае мысленне і лідарскія якасці, а таксама прыняць удзел у новым фармаце навучання, арыентаванага на судачыненні дэмакратыі і інавацыйных лічбавых тэхналогій, запоўніце форму вышэй, каб зарэгістравацца. Абраныя ўдзельнікі прымуць удзел у інтэрактыўных занятках і дыскусіях накіраваных на:

• Палітычныя і сацыяльныя наступствы распаўсюджвання лічбавых тэхналогій, а таксама магчымасці пазітыўнага іх выкарыстання;

• Выяўленне і супрацьдзеянне скаардынаванай прапагандзе і маніпулятыўным паводзінам з боку дзяржаў і карпарацый;

• Магчымасці выкарыстання лічбавых тэхналогій для ўмацавання дэмакратыі і моладзевай актыўнасці;

Таксама вас чакаюць мультымедыйныя творчыя студыі (мантаж відэа, SMM і тэатр), арыентаваныя на лідарства, распаўсюд ідэй і развіццё навыкаў.

**Глядзіце дадатковую інфармацыю ніжэй:**

• Да ўдзелу запрашаюцца студэнты Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, а таксама беларускія студэнты, якія навучаюцца ў Літве і Польшчы. Узрост удзельнікаў - да 27 гадоў.

• Рабочыя мовы лагера – беларуская і руская; праграма і вучэбна-метадычныя матэрыялы распрацаваны на беларускай і англійскай мовах.

• Трэнерамі і лектарамі лагера будуць даследчыкі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, прадстаўнікі EPAM і digital-актывісты.

• Удзел у лагеры бясплатны. Выдаткі на пражыванне, харчаванне і праезд ад месца сустрэчы ў Вільні пакрываюць арганізатары. Арганізатары не аказваюць візавай падтрымкі. Праезд у Вільню аўтобусам ці цягнікам таксама можа быць кампенсаваны.

• Лагер завершыцца стварэннем распрацаваных студэнтамі грамадскіх праектаў. Праектам-пераможцам будзе прапанавана кансультацыйная і фінансавая падтрымка для эфектыўнай рэалізацыі.

• Апошні тэрмін падачы запоўненых формаў – 15 студзеня 2024 г.

З адабранымі кандыдатамі мы звяжамся пасля 20 студзеня 2024 г. Па ўсіх пытаннях пішыце Аляксею Ластоўскаму, aliaksei.lastouski@ehu.lt.